# Другая фаза Інвестыцыйнай праграмы венчурнага капіталу (ІПВК-2)

Месцазнаходжанне:
рэгіянальны праект

Нумар праекта:
51558

Галіна:
інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі

Дзяржаўны/прыватны сектар:
прыватны

Экалагічная катэгорыя:
механізм

Ўстаноўлены тэрмін разгляду Саветам дырэктараў:
27 лістапада 2019 года

Стан:
**прайшоў канчатковы разгляд, чакаецца зацвярджэнне з боку Савета**

Дата публікацыі рэзюмэ праекта на ангельскай мове:
25 кастрычніка 2019 года

## Апісанне Праекта

З дапамогай другой Інвестыцыйнай праграмы венчурнага капіталу (ІПВК-2), якая стала працягам дзеючай праграмы ЕБРР (ІПВК), і яе мэтавага рамачнага механізму фінансавання з аб'ёмам у 100 млн. еўра) Банк развівае інвестыцыі ў тэхналагічныя кампаніі на стадыі пасеву і росту ў форме долевых і квазідолевых інвестыцый (інвестыцыйныя здзелкі памерам да 15 млн. еўра) у краінах аперацый Банка сумесна са сталымі венчурнымі суінвестараў. Аб'ектамі інвестыцый з'яўляюцца інавацыйныя, хуткарослыя малыя і сярэднія кампаніі, якія не атрымліваюць дастатковага фінансавання з-за неразвітасці венчурнага інвестыцыйнага бізнесу, што дапаможа папоўніць недахоп долевых венчурных інвестыцый на рынку. Каб захаваць тэмпы развіцця інвестыцый і задаволіць попыт на фінансаванне падрыхтоўваемых праектаў, на рэшту інвестыцыйнага перыяду ІПВК-2 запытваюцца дадатковыя сродкі.

## Мэты Праекта

і) ІПВК дазваляе Банку развіваць у рэгіёне эканоміку ведаў, экасістэмы высокіх тэхналогій і падтрымліваць інавацыі; іі) абапіраючыся на ІПВК, Банк гуляе

важную ролю ў папаўненні недахопу венчурнага фінансавання ў рэгіёне; iii) ІПВК дае Банку магчымасць захаваць партфельны падыход да высокарызыкоўных, але высокапрыбытковых інвестыцыяў.

## Уздзеянне на пераходны працэс

Механізм ІПВК-2 закліканы садзейнічаць умацаванню канкурэнтнасці і жыццяздольнасці эканомік пераходнага тыпу, развіццю маладых высокаінавацыйных тэхналагічных кампаній, а таксама пашырыць доступ да венчурнага капіталу, які толькі зараджаецца ў рэгіёне дзейнасці ЕБРР. Механізм ІПВК-2 закліканы развіць поспех першага механізму – ІПВК-1 і надаць ключавую падтрымку развіццю навукаёмістай эканомікі ў рэгіёне ЕБРР, як гэта прадугледжана Ініцыятывай ЕБРР ў галіне эканомікі ведаў, а менавіта яе трэцім напрамкам – «Малыя тэхналагічныя кампаніі».

## Інфармацыя пра кліента

Асобна па кожнаму праекту.

## Фінансаванне ЕБРР

50 млн. еўра

## Агульны кошт Праекта

50 млн. еўра

## Экалагічныя і сацыяльныя пытанні

Сам Механізм не аднесены да якой-небудзь з катэгорый у адпаведнасці з Экалагічнай і сацыяльнай палітыкай ЕБРР у рэдакцыі 2014 года, аднак кожны падпраект будзе аднесены да той ці іншай катэгорыі індывідуальным чынам па выніках экалагічнага і сацыяльнага комплекснага абследавання (ЭСКА) і аналізу кампанентаў пераходу да зялёнай эканомікі ў дачыненні да пэўных праектаў і кліентаў. У залежнасці ад таго, да якой катэгорыі будзе аднесены той ці іншы падпраект, пры правядзенні ЭСКА будзе ацэньвацца адпаведнасць структуры кожнага падпраекта патрабаванням ЕБРР.

## Тэхнічнае супрацоўніцтва

Адсутнічае

## Кантактная асоба ў Кампаніі

Бахром Ібрагімаў
+44 20 7338 6000

## Магчымасці для ўдзелу ў праектах

Па пытаннях удзелу ў праекце або закупках просьба звяртацца да кампаніі-кліента.

Праекты ў дзяржсектары: гл. EBRD Procurement. Пытанні па тэлефоне +44 20 7338 6794
эл. пошта: procurement@ebrd.com

## Агульныя даведкі

Даведкі аб праектах ЕБРР, якія не звязаныя з ажыццяўленнем закупак

Тэл.: +44 20 7338 7168; эл. пошта: projectenquiries@ebrd.com

## Прынцыпы інфармавання грамадскасці (ПІГ)

ПІГ вызначаюць усталяваны ў ЕБРР парадак раскрыцця інфармацыі і правядзення кансультацый з зацікаўленымі бакамі каб садзейнічаць больш глыбокаму разуменню і веданню яго стратэгій, палітыкі і аперацыйнай дзейнасці.
Тэкст ПІГ

## Орган па разглядзе скаргаў у сувязі з праектамі (ОРС)

Орган па разглядзе скаргаў у сувязі з праектамі (ОРС) уяўляе сабой механізм, які забяспечвае падсправаздачнасць дзейнасці ЕБРР. Ён дае магчымасць праводзіць незалежны разгляд скаргаў, якія паступаюць ад фізічных асоб і арганізацый адносна праектаў, якія фінансуюцца Банкам і, якія, на думку заяўнікаў, ужо прычынілі ці могуць прычыніць экалагічную і (або) сацыяльную шкоду.

Інфармацыю аб формах падачы скаргаў гл. на старонцы сайта Органа па разглядзе скаргаў у сувязі з праектамі. Згодна з Правіламі працэдуры разгляду скаргаў для атрымання адказаў на любыя пытанні адносна падачы скаргаў або патрабаванняў да іх рэгістрацыі і прызнанню іх прымальнасці можна звяртацца да ўпаўнаважанага ОРС па адрасе: pcm@ebrd.com.